Г.А. Суша,
метадыст аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці

# Выкарыстанне традыцыйных і новых тэхналогій саломапляцення ў практыцы работы дамоў (цэнтраў) рамёстваў і народнай творчасці

Цікавасць грамадства да народнага мастацтва, рамёстваў і промыслаў выклікана пошукамі новых шляхоў аднаўлення парушаных сувязей чалавека і прыроды, вяртання ў культуру традыцый пераемнасці пакаленняў.

Спрыяе вырашэнню гэтай задачы навучанне тэхнікам работы з этнаматэрыялам. У Інбелкульце такая практыка праводзіцца падчас рэалізацыі адукацыйнай праграмы навучальных курсаў. Традыцыйным стала навучанне спецыялістаў дамоў (цэнтраў) рамёстваў і народнай творчасці мастацтву саломапляцення [1].

Вопыт паказвае, што навучанне саломапляценню павінна даваць не толькі практычныя навыкі па выкананню розных рэчаў, але і грунтоўнае ўяўленне аб каранях і гісторыі рамяства, нацыянальных адметнасцях і месцы, якое яно займае ў культуры народа. Пры гэтым вырашаецца шырокі дыяпазон задач: далучэнне да нацыянальных мастацка-рамесніцкіх традыцый; фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці праз усведамленне традыцый народнага мастацтва; развіццё мастацкіх здольнасцей і эстэтычнага густу; выхаванне экалагічнай свядомасці; атрыманне рамесніцкіх навыкаў для стварэння некаторых бытавых і дэкаратыўных рэчаў і магчымасці выкарыстання іх падчас культурна-масавых мерапрыемстваў.

Саломка — самы старажытны з матэрыялаў, якія вырошчваюцца і апрацоўваюцца чалавекам. У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве многіх народаў свету сустракаюцца вырабы, упрыгожаныя ўзорамі, якія складзены з кавалачкаў саламянай стужкі.

Інтарсія — від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, інкрустацыя, якая выконвалася дрэвам па дрэву, была вядомай яшчэ ў Старажытным Егіпце і Старажытным Рыме. Найвышэйшага росквіту інтарсія дасягнула ў эпоху Адраджэння ў Італіі. Яна ўжывалася для ўпрыгожвання дарагой мэблі і іншых прадметаў кавалачкамі каштоўных парод дрэва, косці, перламутру, металу. Моднымі былі інкруставаныя шкатулкі, табакеркі, невялікія столікі. Аднак гэтыя сапраўдныя творы мастацтва былі даступнымі толькі для вельмі заможных людзей.

Ад інтарсіі, ці інкрустацыі, вядзе сваё паходжанне мастацтва аплікацыі саломкай. Дарагія рэдкія матэрыялы народныя майстры замянілі не менш прыгожай, але таннай і даступнай саломкай. Тонкую саламяную стужку дастаткова было акуратна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замацаваць на паверхні, каб атрымаць жаданы эфект ад прыгожага іскрыстага дэкору.

Самыя старыя з вырабаў, упрыгожаных аплікацыяй саломкай, што захоўваюцца ў музеях, адносяцца да XVIII — пачатку XIX ст. У гэты час стала актыўна праяўляцца імкненне сельскіх жыхароў аздабляюць свой побыт дэкаратыўнымі вырабамі. Сельскія майстры, арыентуючыся на вырабы прафесійнага мастацтва, выконвалі свае творы з даступных матэрыялаў, увасабляючы ўласныя тэхналогіі.

У пачатку XX ст. у Беларусі былі знойдзены ў двух паўразбураных цэрквах царскія брамы, вырабленыя ў XVIII ст. Спачатку рэльефныя ўпрыгажэнні на іх былі прынятыя за найтанчэйшую драўляную разьбу з пазалотай. Але падчас даследавання выявілася, што яны абабітыя дэталямі, сплеценымі з саломы. Выкарыстоўваючы абмежаваны набор пляцёнак рознай велічыні, старыя майстры змаглі стварыць арыгінальныя арнаментальныя кампазіцыі.

Царскія брамы, упрыгожаныя саламяным пляценнем, — гэта ўнікальныя творы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Па тым майстэрстве, з якім былі выкананы плеценыя дэталі, арнаменты, можна меркаваць пра іх карані.

Аплікацыя саломкай адрозніваецца ад інкрустацыі тым, што малюнак замацоўваецца не толькі на дрэве, але і на тканіне ці паперы і становіцца даступным для самастойнага авалодання гэтым майстэрствам.

Мастацкія работы з саломкі блізкія і зразумелыя людзям і адыгрываюць вялікую ролю ў эстэтычным выхаванні дарослых і дзяцей у дамах і цэнтрах рамёстваў.

Наяўнасць гэтага матэрыялу і практык работы з ім у розных кутках планеты стала прычынай развіцця разнастайных тэхнік і прыёмаў працы з ім.

Найбольш выразнымі і адметнымі на сённяшні дзень з'яўляюцца аплікацыі саломкай майстроў з Салігорска Раісы Раманені і Людмілы Царыкевіч (кіраўнікі гурткоў заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Беларускі сувенір»). Яны стварылі школу саломапляцення, якая вылучаецца асаблівай стылістыкай і вытанчанай тэхнікай аб'ёмнага пляцення і аплікацыі саломкай.

На Гродзеншчыне плённа працуе ўзорны тэатр моды пад кіраўніцтвам Алы Пярмінавай, дзе ствараюцца цудоўныя калекцыі адзення, упрыгожанага саламянай аплікацыяй. Вучні разам з настаўніцай — удзельнікі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Вывучэнне саломапляцення не толькі фарміруе ў дзяцей і падлеткаў шырокі кругагляд, знаёміць з сучаснымі тэхналогіямі апрацоўкі матэрыялаў, але і дае магчымасць яшчэ ў школе, у гуртках дамоў і цэнтраў рамёстваў далучыцца да стваральнай працы.

Зрабіць працэс навучання больш дынамічным майстру дапамагае абсталяванне і афармленне майстэрні: швейныя машыны, аверлок, прасы, прасавальныя дошкі, камп'ютар і экран, узоры швейных вырабаў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, даведачныя матэрыялы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікае значэнне для эфектыўнасці заняткаў мае выбар аб’ектаў працы. Каб зацікавіць удзельнікаў гуртка саломапляцення, неабходна падбіраць заданні, выкананне якіх звязана з праяўленнем творчасці, самастойнасці і прыводзіць да з’яўлення прыгожых і патрэбных вырабаў. Заданні павінны падбірацца ў залежнасці ад узроўню ведаў і ўменняў навучэнцаў, улічваць іх інтарэсы і магчымасці. Для развіцця мастацкага і эстэтычнага густу неабходна, каб навучэнцы знаёміліся з узорамі дэкаратыўна-прыкладной творчасці, часцей наведвалі выставы і рэгіянальныя святы.

Вывучэнне кожнага раздзела пачынаецца з ўступнага занятку, задачай якога з’яўляецца азнаямленне навучэнцаў з мэтай працы, зместам новага матэрыялу, тэхналагічнай дакументацыяй, арганізацыяй працоўнага месца, правіламі бяспекі працы. Асаблівая ўвага ўдзяляецца паказу прыёмаў працы. Выкладчык імкнецца дамагчыся асэнсаванага асваення ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу тэхналогіі вырабу. Задача выніковага ўрока заключаецца ў замацаванні і кантролі ведаў і ўменняў вучняў. Яна вырашаецца з дапамогай праверачных работ (заданняў, пытанняў, практыкаванняў, тэстаў, крыжаванак і інш.), а таксама ў форме прадстаўлення праекта.

Практычнае навучанне патрабуе ад майстра ці метадыста паглыблення і навуковага падыходу, тлумачэння сутнасці вывучаемых тэхналагічных працэсаў, інструментаў і абсталявання, якія выкарыстоўваюцца. Укараненне новых метадаў звязана з пераходам да асобасна арыентаванага навучання. Іх выкарыстанне стварае ўмовы для творчай самарэалізацыі дзяцей і моладзі, павышае матывацыю да навучання, спрыяе развіццю мыслення, самастойнасці, адказнасці, уменняў планаваць, ацэньваць вынікі. Перш чым пачаць выраб таго ці іншага твора, неабходна разабрацца ў яго канструкцыі, выбраць матэрыялы і распрацаваць тэхналагічную карту. Пры гэтым уважліва абмяркоўваецца кожная прапанова навучэнцаў, выбіраюцца лепшыя рашэнні.

Для педагога і майстра асобасны падыход — гэта, перш за ўсё, улік індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў (іх тэмпераменту і характару, стаўлення да вучобы, адносін у калектыве і г.д.), што дазваляе індывідуалізаваць прыёмы і метады працы на занятках.

Камп’ютарныя тэхналогіі адкрылі новыя магчымасці для стварэння ілюстрацыйнага матэрыялу: відэафільмаў, слайдаў і інш. Камп’ютарная тэхніка дазваляе найбольш поўна праілюстраваць матэрыял.

Удзельнікі гурткоў і студый дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія працуюць практычна ва ўсіх дамах і цэнтрах рамёстваў, на занятках па саломапляценню вывучаюць тэхналогіі і прыёмы працы з саломкай. Яны знаёмяцца з тэхнікай апрацоўкі саломкі, матэрыяламі і інструментамі, узорамі работ народных майстроў. У працэсе работы з саломкай у навучэнцаў развіваюцца вакамер, маторыка рук, з’яўляецца адчуванне колеру, рытму.

Саломка можа выкарыстоўвацца ў якасці як асноўнага, так і дэкаратыўнага матэрыялу. З яе вырабляюць фігуркі людзей і жывёл, пано, сухарніцы, скрыначкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і інш. Для дэкарыравання вырабаў прымяняецца белая і каляровая, фарбаваная, саломка.

Мастацкія магчымасці саломкі надзвычай вялікія. У працах выкарыстоўваюць вонкавую глянцавую паверхню сцябліны, якая добра адбівае святло. Калі размяшчаць элементы аплікацыі ў розных напрамках, узнікае своеасаблівая гульня святла. Стужкі пашчапанай саломкі, прагладжаныя гарачым прасам, ствараюць багатую каляровую гаму, ад светла-залацістага да цёмна-карычневага колеру.

Вельмі цікавай і арыгінальнай з'яўляецца вышыўка саломкай па тканіне. Тэхналогія вышывання саламянымі палоскамі і касічкамі такая ж, як пры вышыванні звычайнымі ніткамі, але вынік прымянення такога нетрадыцыйнага для гэтага віду рукадзелля матэрыялу захапляе нават бывалых вышывальшчыц.

Саламянай вышыўкай упрыгожвалі не толькі карціны або пано. Раней ёю аздаблялі святочнае адзенне сялян, для якіх была недаступная вышыўка залатымі ніткамі, як на касцюмах шляхты.

Для вышыўкі саломкай можна выкарыстоўваць розныя тканевыя асновы: шоўк, атлас, сетку, арганзу, муслін, баваўняныя тканіны.

Але самае распаўсюджанае ўжыванне саломкі — пляценне. Майстры саломапляцення маглі вырабіць з саломкі розныя па свайму прызначэнню рэчы — ад простай дзіцячай цацкі або саламяных капялюшыкаў для дам да выдатных сурвэтак, пано, жаночых упрыгажэнняў, якія смела можна называць творам мастацтва і змяшчаць у музеях.

З саламяных форм, выкананых у розных тэхніках, ствараюцца сіметрычныя ўзоры, кветкавыя арнаменты, якія выкарыстоўваюцца пры афармленні розных пано.

Прырода здольная абуджаць у людзях лепшыя пачуцці. Важна навучыцца заўважаць прыгожае ў дэталях. У такім звычайным прыродным матэрыяле, як саломка, закладзены неабмежаваныя магчымасці. Раскрываючы іх, можна ствараць сапраўдныя творы мастацтва.

Асноўная мэта навучання саломапляцэнню ў сістэме ДАД шляхам рэалізацыі адукацыйнай праграмы навучальных курсаў — азнаёміць у спецыялістаў сферы з асноўнымі прыёмамі, тэхналогіямі і матэрыяламі, якімі карыстаюцца пры вырабе твораў з саломкі для далейшай папулярызацыі асвоеных практык падчас прафесійнай дзейнасці ва ўстановах культуры.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Суша, Г.А.* Нацыянальныя беларускія промыслы і рамёствы. Саломапляценне ў Беларусі / Г.А. Суша // Актуальныя аспекты культурна-адпачынкавай дзейнасці ў аграгарадках і сельскай мясцовасці. — Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2016. – С. 97—101.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ